# 28 кастрычніка 2021 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовы блок «Каложскі абраз Божай Маці»

Дызайн Алены Мядзведзь.

Блок друкаваўся ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц.Непагодзіна».

Аддрукаваны таксама без перфарацыі.

Каложскі абраз Божай Маці як цудатворны шануецца з канца XVI – пачатку XVII стагоддзя і быў галоўнай святыняй Гродзенскага краю.

У 1915 годзе пры эвакуацыі абраз быў вывезены ў Расію і страчаны. Доўгі час лічылася, што копіі абраза, напісаныя да яго знікнення, таксама не захаваліся, але ў канцы 2018 года на адным з антыкварных аўкцыёнаў Германіі быў знойдзены і выкуплены Каложскі абраз Божай Маці.

Здабыты абраз захоўваецца сёння ў старажытным і ўнікальным храме Беларусі, помніку архітэктуры XII стагоддзя – Свята-Барыса-Глебскай Каложскай царкве.

Праект падрыхтаваны па матэрыялах і ў супрацоўніцтве з прыходам храма Святых мучанікаў благаверных князёў Барыса і Глеба ў Гродне .

Прымяняецца тэхналогія дапоўненай рэальнасці: пры навядзенні на паштовы блок камеры гаджэта з запушчаным прыкладаннем AR MARKA BELARUS з'яўляецца спецыяльна створаны сцэнарый.

У дзень выпуску паштовага блока ў абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 25 Гродна будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/node/7540*